ОЛЕШО, Олеши, Олешовы, Олешевы. Определением Псковск. ДДС от 23.12.1858 в VI часть родословн. книги внесён опочецкий помещик отст. артиллерии штабс-капитан Викентий Матвеевич О., на основании определения Минск. ДДС от 22.02.1835, утверждённого Времен. Присут. Герольдии, о чём было представлено свидетельство Департамента Герольдии за № 2 626 [РГИА. Ф.1343, оп.26. д.3529].

ОРДЫЛОВСКИЕ. Предъявившего свидетельство Герольдии от 31.08.1834 за № 7 677, об утверждении в правах древнего дворянства по Виленской губ., губ. секр. Антона Викентьевича О. с женою, опочецкою помещицею, Дарьей Ивановной, урожд. Плен, Псковск. ДДС своим определением от 08.08.1859 внесло в I часть родословн. книги [ГАПО. Ф.110, оп.1, д.718].

ОСЕНДОВСКИЕ. В 1868 г. в Псковск. ДДС подавал прошение некий О., но никакого решения не последовало из-за непредставления документов [ГАПО. Ф. 110, оп. 1, д. 582, л. 20]. В фонде Департамента Герольдии имеется одно дело Осендовских, утверждённых в правах древнего дворянства по Витебской губ. в 1834 г. [РГИА. Ф.1343, оп.26, д.4142].

ОСТРОВСКИЕ. В Псковск. ДДС 15.05.1854 подавал прошение о внесении в родосл. книгу, на основании определений Витебск. ДДС от 18.07.1835, 04.09.1836, 08.09.1836 и 21.10.1837 о признании О. в правах древнего дворянства, столоначальник Псковск. Казённой палаты Осип Антонович О. Решение о внесении в родосл. книгу Псковск. губ. вынесено не было, так как род ещё не был утверждён в правах дворянства Правит. Сенатом. В 1859 дело было сдано в архив. [ГАПО. Ф.110, оп.1, д.721].

vytoki.net

Годнасьць: Выданьне Згуртаваньня Беларускай Шляхты. 1997, № 1(3).

ГІСТОРЫЯ РОДАЎ

# ДВАРЭЦКІЯ-БАГДАНОВІЧЫ: МАТАР'ЯЛЫ ДА ГЭНЕАЛЁГІІ

СЯРГЕЙ РЫБЧОНАК

Як сьведчаць крыніцы, род Дварэцкіх-Багдановічаў вядомы на землях Беларусі з 16 ст. Нягледзячы на пазьнейшае расьсяленьне ў Жмудзь, Польшчу й на Ўкраіну, а потым і ў Расею, яго несумненна можна лічыць за аўтахтонны шляхецкі род. Да 18 ст. ён вельмі разросься й асобныя галіны пачалі карыстацца рознымі гэрбамі - «Лада», «Астоя», «Тама», «Магіла»(?), але ня «Роля», як цьвердзіць энцыкляпедычны слоўнік Бракгаўза й Эфрона.

Пасьля анэксіі Рэчы Паспалітай усе яны спрабавалі атрымаць дваранства Расейскай імперыі, прычым справы з гэтага праходзілі па Дваранскіх Дэпутацкіх сходах 5-і губерняў – Віленскай, Віцебскай, Горадзенскай, Магілёўскай і Менскай. Гэтае, а таксама частае перамяшчэньне асобаў ускладняла справу. Распрацоўка гэнеалёгіі высьветліла, што амаль усе Дварэцкія-Багдановічы мелі цяжкасьці з доказамі па першых каленах, а некаторыя іх блыталі, што, відаць, тлумачылася недахопам актавых матар'ялаў па ўсходніх абшарах Княства.

Прозьвішча па-польску пісалася *Dworzecki-Bohdanowicz*, а па-расейску *Дворжецкий-Богданович*. Да 19 ст. асноўным прозьвішчам было Дварэцкі, пазьней яны, пераважна, выступаюць як Багдановічы, а Дварэцкі робіцца прыдомкам.

Дзеля напісаньня артыкула аўтар карыстаўся архіўнымі зьвесткамі толькі з Нацыянальнага Гістарычнага архіва Беларусі.

* * *

Найбольш поўнай сталася гэнеалёгія Дварэцкіх-Багдановічаў, якія выводзіліся пад гэрбам "Лада" (гл. пакаленны росьпіс 1). Першапачаткова род быў прызнаны ў дваранстве Расейскай імперыі 28.01.1819 Горадзенскім і 14.11.1825 Віцебскім Дваранскімі дэпутацкімі сходамі з аднясеньнем да VI-й часткі радаводных кнігаў.

## ДВАРЭЦКІЯ-БАГДАНОВІЧЫ ГЭРБУ «ЛАДА»
(Пакаленны росьпіс 1)

***1 калена***

**1 Фёдар**
Вядомы зь імя сына.

vytoki.net

*2 калена*

2/1 **Сямён Фёдаравіч Дварэцкі**



Магілёускі баярын. За шматгадовую адданую службу атрымаў ад князя Івана Васілевіча Крошынскага маёнткі Обаль і Лютневічы (Ляднeвічы, Ладаўніцы) ў Аршанскім павеце. Кароль Жыгімонт III Аўгуст 1554.09.08 канфірмаваў гэтае наданьне пад абавязкам выкананьня вайсковай земскай службы.

*3 калена*

3/2 **Іван**
4/2 **Багдан**

*4 калена*

5/4 **Мікалай**
6/4 **Пётр**
Магчыма, на падставе, што бацька меў імя Багдан, пачаў пісацца Дварэцкім-Багдановічам. У час мяцяжу Хмяльніцкага, ратуючыся ад маскоўскай навалы, перасяліўся ў Інфлянты (г.Мітава), дзе трапіў у шведзкі палон і страціў шмат рухомасьці й каштоўных папераў.
х Ганна Хацятоўская
7/4 **Іван**

*5 калена*

8/6 **Іван**
9/6 **Фёдар**
Меў ад уладальніка Шклоўскага староства графа Шанеўскага закладную зямлю ў маёнтку Гарадзішча (1662).
х Ганна Фулер
10/6 **Андрэй**
Суправаджаў за мяжу турэцкіх паслоў (1670), служыў у рэгіменце Самуэля Цеханавецкага, ротмістра Ашмянскага (1698). Набыў маёнткі Карасі (Аршанскі пав.) і Калдычава (Наваградзкае ваяв.).
11/6 **Міхал**
Мечнік Смаленскі, па сьмерці Стэфана Бялецкага (прывілей 1667 Караля Яна), пазьней суддзя земскі Аршанскі (1679).
х Апалёнія Дурасевіч (*паводле гэрбоўніка Банецкага*).

*6 калена*

12/9 **Андрэй**

vytoki.net

13/9 **Іван**
14/9 **Міхал-Дамінік**
Будаўнічы Аршанскі (1705), суддзя на Віленскай кадэнцыі Галоўнага Літоўскага Трыбуналу ад Аршанскага пав. (1711) - *Банецкі.* Купіў у 1700 у Аляксандра Пракаповіча, гараднічага Аршанскага, маёнтак Калдычаў (Наваградзкае ваяв.). Сыны падзялілі яго ў 1722 г., дзецям з 1-га шлюбу дасталася частка Крыштафаўшчына, з 2-га Петраўшчына. Валодаў таксама маёнт.Крыва й Друцк, якія набыў у 1728 г. ад Хлявінскіх.
x1 Мар'янна Левальт-Язерская
x2 Канстанцыя Шэмет
15/9 **Афанасій**

*7 калена*

16/12 **Фёдар**
17/13 **Міхал**
18/14/1 **Антоній**
Чашнік Аршанскі.
19/14/1 **Фёдар**
Крайчы Аршанскі. Прадаў у 1753 г. сваё ўладаньне Бердычаўшчына й маёнт.Калдычаў разам з пляменьнікамі (24 і 25) Леану-Паўлу Валадковічу, войскаму Менскаму, і ягонай жонцы Францішцы, народжанай дэ Дораэс.
20/14/2 **Васіль**
21/14/2 **Яраслаў**
22/15 **Пётр**

*8 калена*

23/17 **Станіслаў**
24/18 **Юрый**
Прадаў сваю частку маёнт.Калдычаў, Язершчыну, разам зь дзядзькам (19) і братам (25).
25/18 **Ян**
Мечнік Ашмянскі. Саступіў дзядзьку Фёдару (19) сваю частку Бердычаўшчыны з маёнт.Калдычаў. Узяў у пасаг за жонкаю маёнт. Сітавішча ў Наваградзкім ваяв. (запіс 1761 яе бацькоў - Казімера, канюшага Упіцкага, і Барбары з Дашкевічаў, лаўчанкі Горадзенскай).
x 1761 Ганна ...
26/19 **Мацей**
* 1762
Паручык легкаконнага ўланскага палку ў рэгіменце Караля Станіслава-Аўгуста, пасьля анэксіі Рэчы Паспалітай звольнены з войска загадам фэльдмаршала Суворава (1795). Пазьней часова жыў на зямлі кн.Радзівіла ў фальв.Замір'е.
x Разалья ...

vytoki.net

27/20 **Баніфацый**
х ... Бардзілкоўская
28/20 **Юзаф-Фэліцыян**
х Агата Арэльская
***9 калена***

29/25 **Юрый-Францішак**
* 1763
Ротмістар Пінскі (1789). Прадаў разам з братамі ў 1791 спадчыну Мацею Рудашэўскаму, суддзю Ковенскаму, й яго жонцы Алене зь Лембічаў. Купіў у 1817 у Несялоўскіх маёнт.Пуцыняны (Наваградзкі пав.).
х Тарэза Барысевіч
30/25 **Юзаф**
* 1764
Разам з сынамі перасяліўся ў Польшчу, жыў у Крулеўцы-Польскім Ломжынскай акругі.
31/25 **Станіслаў**
* 1767, † 1819
32/25 **Бэнедыкт**
* 1778
33/25 **Антоній**
* 1782
Займаўся арандатарствам - у 1832 у в.Калка (Бабруйскі пав.), пазьней перасяліўся на Барысаўшчыну.
х Зоф'я Вішчынская
34/26 **Юзаф**
* 1786, † 1845
У 1830 утрымліваў дзіцячы пансіён у Пінску, вывадам Менскага ДДС ад 29.03.1829 быў прызнаны ў дваранстве пад гэрбам «Магіла». На самой справе належаў да гэтага роду, а гэрб вынайшаў у старапольскіх друкаваных крыніцах. Указам Сянату ад 27.03.1846 адмоўлена ў зацьверджаньні ў дваранстве Расейскай Імперыі.
х Вераніка Грушкоўская
35/27 **Антоній**
36/28 **Яўхім**
* 1774
Тытулярны радца, лаўнік, потым суддзя Лепельскага пав. суда (1825). У пасагу за 2-ю жонкаю ўзяў маёнт.Туроса (Лепельскі пав.), якім валодаў з 1820.
х1 Барбара Сінклеўская
х2 Барбара Селішч
37/28 **Вінцэнт**
* 1775
х Вікторыя Міладоўская
38/28 **Антоній**
* 1777

**vytoki.net**

Лаўнік Лепельскага пав. суда (1824). Узяў у пасагу за жонкаю маёнт. Сушын (Лепельскі пав.).
х Ганна Ядзевіч
39/28 **Ян**
Перасяліўся ў Польшчу.

***10 калена***

40/29 **Вінцэнт-Францішак**
* 1793
Наваградзкі гранічны суддзя (1793). Купіў у 1834 г. у кн.Вітгенштэйна маёнт.Гарадзея. Прадаў у 1836 г. Каралю Манюшку, капітану войскаў польскіх, і яго жонцы Альбіне з Корсакаў маёнт.Пацыняны.
41/30 **Ян**
42/30 **Вінцэнт**
43/30 **Юзаф**
44/31 **Дамінік-Бэрнард-Андрэй**
* 1801
Ротмістар.
45/31 **Вінцэнт-Караль**
* 1801
На вайсковай службе (1828-39) - ротмістар, потым маёр, гусарскага кн.Вітгенштэйна палка. Удзельнік вайны Расеі з Турцыяй 1828-29. Жыў на Ўкраіне, унесены ў II-ю частку дваранскіх радаводных кнігаў Падольскай губ.
х ... Білінская, д.Мікалая Б.
46/31 **Юзаф-Казімер**
* 1806
Паручык.
х Вольга Лучынская
47/31 **Юстын**
* 1812
Манах-місіянер Віленскага канвенту.
48/31 **Ігнацій-Аляізій**
49/33 **Караль-Браніслаў**
* 1830, † 1878
Галоўны лекар 4-га Каўкаскага вайсковага шпіталя. Удзельнік Крымскай вайны на Каўказе, кавалер ордэнаў сьв.Станіслава 2-й і 3-й ст., крыжа "За службу на Каўказе". Стацкі радца (1877).
50/33 **Мікалай**-Гэктар
* 1833
Вучыўся ў Берасьцейскім кадэцкім корпусе, капітан 118-га пешага Саратаўскага палка (1870). Удзельнік Крымскай вайны й падаўленьня Паўстаньня 1863-64, кавалер ордэна сьв.Станіслава 3-й ст.
х Кляўдзія ... , д.Вінцэнта ...

51/33 **Юзаф-Ян**
* 1834
Штабс-капітан у адстаўцы, прыпісаўся да дваранства Арлоўскай губ. (1872), жыў у с.Пятроўскім.
52/33 **Мальвіна**
53/33 **Алена-Юлія**
* 1836
54/33 **Алімпія-Катарына**
* 1844
55/34 **Эльяш**
* 1820
56/34 **Караль-Эразм**
* 1826
Лекар 44-га пешага Камчацкага палка, удзельнічаў у Крымскай вайне й падаўленьні Паўстаньня 1863-64. Надворны радца (з 1868).
57/36/1 **Аляксандар**
* 1794
Лаўнік Лепельскага пав. суда, пазьней служыў у Віцебскай казённай палаце, калежскі рэгістратар.
х Юлія Радкевіч
58/36/2 **Тадэвуш**
* 1812
59/36/2 **Ганна**
60/36/2 **Юдыта**
61/37 **Ян**
* 1802
Жыў у 1863 г. у фальв.Шчаўканы (Чэрыкаўскі пав.).
х Зоф'я Сялява, д.Клеафаса С.
62/37 **Юзаф**
* 1812
Тытулярны радца. Купіў у 1844 у Макрыцкіх 6 дзесяцінаў зямлі ў Барысаўскім пав., пасьля жыў у Барысаве.
х Леакадзія Пясьляк
63/37 **Марцэлій**
* 1813, † 1872
Надворны радца. Варонежскі гарадзкі архітэктар (1872), будаваў таксама ў Маскве (?).
х Варвара Аньненкава, д.Якава А.
64/38 **Юзаф**
* 1801
Адвакат Віцебскага пав. суда (з 1822).
65/38 **Мар'яна**

*11 калена*

66/40 **Аўгустын**-Аляксандар-Ян-Юрый
* 1822, † 1860

vytoki.net

Чавускі гараднічы, штабс-ротмістар.
х Флярэнціна Яблонская, д.Крыштафа Я.
67/45 **Станіслаў-Гэрард**
* 1846
68/45 **Марыя-Леапольда**
* 1846
69/45 **Аўгустына-Ганна**
* 1846
70/45 **Марыя-Тэафіля**
* 1849
71/45 **Марыя-Фэлікса**
* 1850
72/45 **Эдмунд-Мікалай**
* 1852
73/46 **Каміл**
74/49 **Леанора**
* 1858
75/49 **Мечыслаў-Ксаверый**
* 1863
Чыноўнік па сьпецыяльных даручэньнях пры Саратаўскім губернатары (з 1886). Перайшоў у праваслаўе, перахрысьціўся на імя Вечаслаў. Прыпісаўся да дваранства Стаўрапальскай губерні (1900).
х Аляксандра Іванова, д.Георгія І.
76/49 **Антоній-Аляксандар**
* 1868
77/49 **Юзаф**
* 1870
Аднадворац мяст.Белая Царква (Кіеўскай губ.).
78/50 **Сяргей**
* 1861
79/50 **Леанід**
* 1861
80/50 **Вера**
* 1863
81/50 **Аляксандар**
* 1865
82/57 **Ігнацій**
* 1822
83/57 **Антоній**
* 1824
х Тэкля Лускіна, д.Казімера Л.
84/61 **Вінцэнт-Стэфан**
* 1837
Тытулярны радца, служыў у Магілёўскім губ. казначэйстве.
х Алена Бярнацкая, д.Самуэля Б.

vytoki.net

85/61 **Клеафас-Захарыяш**
* 1841
Калежскі рэгістратар, працаваў у Чэрыкаўскім пав. вучылішчы.
х Юлія Падбярэская, д.Яна П.
86/61 **Ванда**
х штабс-капітан Караль-Леанід Мянжынскі, с.Міхала М.
87/61 **Баляслаў-Максімільян**
* 1842
Вучыўся ў Полацкім кадэцкім корпусе, прапаршчык 107-га пешага Траецкага палка.
88/62 **Юзаф-Ірыней-Анастазій**
* 1836
89/62 **Вінцэнт-Антоній**
* 1846
90/62 **Яўстахій-Клеафас**
* 1849
91/63 **Мітрафан**
* 1846
92/63 **Зінаіда**
* 1849
93/64 **Міхал**
94/64 **Станіслаў-Юзаф**
95/64 **Тадэвуш-Багдан-Абдон**
95/64 **Юзаф-Ціт**
* 1856
х1 Марыя Багдановіч, д.Антонія Б.
х2 Ядвіга Гутоўская
На пачатку 20 ст. жылі ў Віцебскай губ.
96/64 **Марцэлій-Віктар**
* 1865

*12 калена*

97/66 **Канстанцыя**
* 1849
98/66 **Марыя**
* 1852
99/66 **Юзэфа-Алена**
* 1854
100/66 **Вінцэнт**
* 1856
101/75 **Яўген**
* 1893
102/83 **Гіпаліт-Аляксандар**
* 1859
х Ганна ... , д.Леана-Афанасія ...

vytoki.net

103/84 **Аляксандар**
* 1874
х Кацярына ДЗякава, д.Мікалая ДЗ.
Калежскі радца, служыў у Магілёўскім губ. казначэйстве (1911).
104/84? **Васіль**
105/85 **Адам**
* 1878
106/95 **Максімільян**
* 1882
107/95 **Марыя-Тарэза**
* 1887
108/95 **Міхаіл**
* 1891
109/95 **Браніслаў**
* 1897
***13 калена***

110/102 **Антоній**
* 1888
111/102 **Іосіф**
* 1890
Жыў у Казані.
112/103 **Усевалад**

НГА Беларусі. Ф.319, воп.2, спр.886: Справа пра дваранства роду Дварэцкіх-Багдановічаў (Вывад 29.01.1819: Горадзенскі ДДС, указ Сената й зацьвярджаньне 30.10.1842); Ф.319, воп.2, спр.160: Справа пра дваранства роду Дварэцкіх-Багдановічаў (Віцебская галіна. Спрабавалі зацьвердзіцца пад гэрбам «Магіла», скарыстоўвалі, верагодна, дакументы магілёўскай галіны роду гэрбу «Тама»); Ф. 2512, воп.1, спр.138, с.463-470 адв.: Вывад дваранства рода Дварэцкіх-Багдановічаў Віцебскага ДДС 14.11.1825; Ф.2512, воп.1, спр.791, с.2 адв.-3; Ф.2512, воп.1, спр.810, с.164-166; Ф.2512, воп.1, спр.990, с.99-101; Ф.2512, воп.1, спр.1009, с.4-5. Boniecki A. Herbarz Polski. W-wa, 1902. T.V. S.122.

* * *

Гэнеалёгія галінаў Дварэцкіх-Багдановічаў, якія карысталіся гэрбам «Астоя» зьмененая[1] (гл. пакаленны росьпіс 2 і 3), мае мноства прабелаў, што тлумачыцца перш за ўсё іх пражываньнем на тэрыторыі Віленскай губерні. У архівах Вільні павінны знаходзіцца й асноўныя матар'ялы па іхнай гэнеалёгіі. Менскія дакументы, аднак, уяўляюць

[1]Пра зьмененую «Астою» сьведчыць пячатка, прыкладзеная 18.06.1860, за подпісам: "За предводителя Дворянства Виленский Уездный Судья Дворжецкий" (Пакаленны росьпіс 3, N28?). - *Заўв. рэд.*

vytoki.net

вялікую цікавасьць ня толькі зьвесткамі пра прадстаўнікоў роду, якія жылі на Вілейшчыне (яна да 40-х г. 19 ст. знаходзілася ў складзе Менскай губерні), але, найперш, спробаю аб'яднаньня галінаў роду гэрбаў «Лада» й «Астоя» зьмененая.

## ДВАРЭЦКІЯ-БАГДАНОВІЧЫ ГЭРБУ «АСТОЯ» ЗЬМЕНЕНАЯ
(Пакаленны росьпіс 2)

*1 калена*



1 **Пётр**
Судзіўся ў 1669 зь зямянінам Інфлянцкага княства Самуілам Вестэрманам, сыны спагналі пазыку ў 1672.

*2 калена*

2/1 **Фёдар**
Уладальнік маёнт.Карасі (Аршанскі пав.). Дазволіў у 1696 сынам ад першага шлюбу (4, 5, 6) карыстацца ў маёнтку рухомасьцю.
х1 ...
х2 ...
3/1 **Міхал**

*3 калена*

4/2/1 **Андрэй**
5/2/1 **Іван**
Стражнік Аршанскі. У 1717 пазычаў у Зьміеўскага.
6/2/1 **Міхал-Дамінік**
Будаўнічы Аршанскі. Купіў у 1697 у Астрэйкаў маёнт.Колдычава-Пракаповічаўскае з в.Навасёлкі. У 1703 жонка адказала сваю спадчынную частку маёнт. Колдычаў і закладны маёнт.Зьдзітаўцы-Яленікі, якім валодаў Радамыскі, мужу, сынам і дачцы Ганне. У 1711 Міхал-Казімер Кацёл, падскарбі Літоўскі, пратэставаў з нагоды нявыплаты ім перавозных.
х Мар'яна Левальт-Язерская
7/2/2 **Фэліцыян**
8/2/2 **Павел**
У 1701 валодаў маёнт.Трумпольле й 7-ю валокамі зямлі па пераказу Аляксандра Нарушэвіча, старосты Ўшпольскага. У 1717 перадаў сваю спадчынную частку маёнт.Карасі братам (5, 6) і пляменьнікам (11, 12).
9/2 **Афанасій**
10/3 **Іван**

vytoki.net

*4 калена*

11/4 **Фёдар**
12/4 **Юрый**
13/5 **Міхал**
14/5 **Юзаф**
Стражнік Літоўскі, гараднічы Смаленскі. Валодаў маёнт.Малая Арава (Аршанскі пав.), на які ў 1748 зрабіў наезд Пётр Савіч-Корсак, харужы Наваградзкі.
15/6 **Антоній**
х Мар'яна Душэўская
16/6 **Адам**
17/6 **Аляксандар**
18/6 **Фёдар**
19/6 **Васіль**
х Зузана Гудоўская
20/6 **Ганна**
21/6 **Эльжбэта**
Судзілася з братамі з-за завяшчаных бацькам грошай.
х Дамінік Яцыніч, гараднічы Слонімскі

*5 калена*

22/13 **Мартын-Андрэй**
Падпаручык Троцкага ваяв. (гэтак !). Жыў у Рэчыцкім пав.

*6 калена*
23/22 **Ігнацій**
Харужы войскаў літоўскіх, потым расейскіх.
24/22 **Ян-Пётр**
Рэчыцкі межавы суддзя.
25/22 **Юрый**

## ДВАРЭЦКІЯ-БАГДАНОВІЧЫ ГЭРБУ «АСТОЯ» ЗЬМЕНЕНАЯ
(Пакаленны росьпіс 3)

*1 калена*

1 **Самуэль**
Уладальнік маёнт.Обаль і Ладоўнічы (Аршанскі пав.). 1 і 2 у справе не згаданы, аднак, паводле *Банецкага,* ёсьць у вывадзе 13.12.1802 Віленскага ДДС.

*2 калена*

2 **Станіслаў**

vytoki.net

*3 калена*

3/2 **Ян**
Драгунскі ротмістар. У 1663 забіты разам з жонкаю ў мяст.Галаўчыне падчас наезду Андрэя Адамовіча. Пра гэта браты падавалі пратэст.
4/2 **Міхал**
5/2 **Павел**

*4 калена*

6/4 **Барталамей**
Атрымаў у 1688 ад цёткі Канстанцыі Корвін-Касакоўскай маёнт.Хршчаневічы або Гелваны (Віленскае ваяв.). Валодаў маёнт.Пырашаў (Наваградзкае ваяв.). У 1697 пакінуў тэстамент, прызначыў братоў апекунамі дзяцей.
х Катарына Манкевіч
7/4 **Базыль**
У 1704 жонка адказала свой пасаг. У 1716 заклаў Марцыяну Прошынскаму, стражніку Бранскаму, палову маёнт.Хршчэнішкі або Гелваны (Віленскае ваяв.).
х Канстанцыя Грондзкая (х1 ... Шанкоўскі), д.чашніка Вількамірскага ... Г.
8/4 **Багуслаў**
Чашнік Наваградзкі. У 1705 заклаў маёнт.Гелваны, Рэша або Валоўкі й палац у Вільні Крыштафу Белазору, каноніку Віленскаму, дзеля забеспячэньня швагеркі па Барталамею. Таксама заклаў палову маёнт. Хршчэнішкі згаданаму М.Прошынскаму.

*5 калена*

9/6 **Антоній**
10/6 **Юрый**
11/6 **Даміцэля**
12/7 **Цыпрыян**
Прадаў у 1773 Станіславу й Еве зь Белазораў Тышкевічам, цівунам Гандынскім, частку маёнт.Крэткомп (Ількейскі пав.).
13/7 **Ігнацій**
Ротмістар Самагіцкі.
14/7 **Дамінік**
Мастаўнічы Сакольскі, ротмістар Вількейскі.
15/7 **Фаўстын**
Ротмістар Горадзенскі (1784), мастаўнічы Сакольскі (1794). Пажыцьцёва валодаў в.Лойкі (Горадзенская каралеўская эканомія) і домам у мяст.Саколка.

*6 калена*

16/12 **Антоній**

vytoki.net

17/12 **Юзаф**
18/12 **Тамаш**
Паручык Смаленскі.
19/13 **Вінцэнт**
* 1785
20/14 **Станіслаў**
Ротмістар Самагіцкі.
21/14 **Юзафат**
22/14 **Вінцэнт**
23/14 **Юльлян**
24/14 **Фэліцыян**
25/15 **Ануфрый**
Ротмістар Горадзенскі, падкаморы Вілейскі. Арандаваў у 1788 і 1791 у Станіслава Тышкевіча, кашталяна Самагіцкага, маёнтак Лагойск, а ў 1793 у Тадэвуша Тышкевіча, кашталяна Самагіцкага. Валодаў у 1791 закладным фальв.Васішкі, Дароты-Юзэфы Салагуб, належным да маёнт.Івянец (Менскае ваяв.). Арандаваў у 1794 у кн.Дамініка Радзівіла маёнт.Сьляпянка. Набыў у 1798 у Яўхіма Хамінскага, стольніка Ашмянскага, маёнт.Рускае Сяло з фальв.Галаўшчына й Папоўцы (Ашмянскі пав.), пазьней пераказаў брату Ігнацію (26). Купіў у Бэнедыкта Прысецкага, шамбяляна Польскага двара, маёнт.Касьпяроўшчына, а ў 1801 у Дамініка Прысецкага, капітана войскаў расейскіх, маёнт.Мехаўшчына.
х Канстанцыя Прысецкая
26/15 **Ігнацій**
Ротмістар Смаленскі. Арандаваў у 1792 у Тамаша Акуліча, суддзі земскага Смаленскага, сталовы маёнт.Сьмілавічы (Алыцкая аканомія).

*7 калена*

27/18 **Адам**
28/25 **Фэрдынанд**
Межавы суддзя Вілейскі, кавалер ордэна сьв.Станіслава 4 ст. (1829). Удзельнік Паўстаньня 1831, памілаваны царскім урадам.
х Тарэза Лоская
29/25 **Ігнацій-Гэляш**
* 1807
30/25 **Ян-Рафал**
Актыўны ўдзельнік Паўстаньня 1831, быў спачатку ў аддзеле Адахоўскага (Вілейка), пасьля ў Дэмбінскага (Ашмяншчына). Згінуў бязь вестак, магчыма, сышоў за мяжу.
31/25 **Гэнрык-Тамаш**
* 1814
32/26 **Фаўстын-Аўгуст**
х Ганна Воўк

*8 калена*

33/28 **Ян-Мэльхіёр**
34/28 **Міхал-Казімер**
35/28 **Юстын-Ян**

НГА Беларусі. Ф.319, воп.2, спр.3828: Справа пра дваранства роду Дварэцкіх-Багдановічаў. Boniecki A. Herbarz Polski. W-wa, 1902. T.V. S.122.

* * *

Зьвесткі пра гэнеалёгію Дварэцкіх-Багдановічаў, якія ўжывалі гэрб «Тама» й жылі пераважна ў Магілёўскай губерні, вельмі фрагментарныя й не даюць магчымасьці стварыць які-кольвек цэльны радавод. Тлумачыцца гэта тым, што матар`ялы мясцовых дваранскіх установаў амаль не захаваліся. Вывучэньне дакументаў былога архіву Дэпартамента Гэрольдыі несумненна прывядуць да стварэньня радаводу гэтай галіны.


vytoki.net

МАЛЫ ГЭРБАР

## АКІНЧЫЦЫ ГЭРБУ «АКШАК»

ІРЫНА ШПІЛЕЎСКАЯ



Габрыэль, Мацей, Ян, Тэадор і Сямён Акінчыцы атрымалі, за заслугі ў ваеннай службе, в.Ярцава, Налібокі, Філіповічы, Малужаўка і Багайск (Старадубскі пав.) (прывілей 1679 Караля Яна).

Базыль, сын Мацея, валодаў (1722) ленным засьц.Акінчыцы (Менскі пав.), ад кн.Ганны з Сангушкаў Радзівіл, і маёнт.Пласковічы ці Галынка (Наваградзкі пав.), ад Міхала Пласкавіцкага. Апошні маёнтак Базыль адказаў у 1735 сынам Якубу, Людвіку, Яну, Станіславу й Ігнацію. Якуб прадаў у 1748 сваю частку братам: Станіславу, аб'езчыку гранічнаму, і Ігнацію. Яны, разам з Якубам, купілі ў Людвіка й Яна іх часткі маёнтку. А потым, разам з сынам Якуба Тамашам (*1740), прадалі ў 1786 Пласковічы Юзафу Пласкавіцкаму. Станіслаў, тэстаментам 1790, пакінуў грошы сынам Юзафу й Флярыяну. Юзаф купіў у 1808 у Юзафа й Гіпаліта Валодзькаў фальв.Сакалятычы (Слуцкі пав.).

Тамаш меў некалькіх сыноў, адзін зь іх Юзафат (*1768), які з Францішкаю з Доўнараў меў дзяцей, між іншымі - Юзафа (*1803). У Юзафа быў сын Ян, які з Эміляй-Разаляй Астольскай меў сына Фабіяна (*1886, † 1943), вядомага ў XX ст. беларускага грамадзка-палітычнага дзеяча.

У XIX ст. прадстаўнікі роду жылі пераважна ў Менскім павеце.

Прызнаныя ў дваранстве Расейскай Імперыі вывадам Менскага ДДС 08.10.1815, зацьверджаныя ўказам Сената 20.08.1853 (1 частка РК).

НГА Беларусі. Ф.319, воп.2, спр.2307; воп.1, спр.62, арк.274-275. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн.,1993. Т.1. С.81.

## БУРАЧКІ ГЭРБУ «НАЛЕНЧ»

ЗЬМІЦЕР ЯЦКЕВІЧ

Магілёўскі род мяшчанскага паходжаньня, які атрымаў шляхецтва гэтак-жа, як і Пара-Лавановічы [гл. «Годнасьць» № 1(2), 1994].

Іван Бурачок валодаў у г.Магілёве зямлёю ў Дубровенскім абрубу. Ягоны сын Апанас, як і бацька, мясцовы купец, бурмістар магілёўскага магістрату (1642).

Сын Апанаса - Арцём (*1650, † 1723), заможны купец, лаўнік (1685),

vytoki.net



радца скарбовы (1688), бурмістар (1697-1709) магілёўскага магістрату, неаднаразовы дэпутат розных пасольстваў да вышэйшых асобаў Рэчы Паспалітай. Дзякуючы ягоным намаганьням у 1725 быў атрыманы каралеўскі прывілей на Крыжаўзьдзьвіжанскую царкву. Сам ён валодаў зямлёю каля Ўсьпенскай царквы. У шлюбе з Хлявінскаю меў дзяцей Іосіфа, Пятра, Самуіла й Мар'яну, якая замужам за Янам Карабанькам, бурмістрам Магілёўскім, у 1728 шлюб скасаваны. Іосіф Арцёмавіч недзе ў 1723/52 пераехаў у Шклоў, меў сына Данілу, ды ўнукаў - Антона й Ядвігу.

Пётр Арцёмавіч з Мар'янаю з Хамянтоўскіх меў сына Яна. Ён быў лаўнікам (1765), радцам (1766-1773) і бурмістрам (1769). Валодаў зямлёю ў Астрожскай сотні, у Баровай і Сярэдняй Лавах, быў старастам Мікалаеўскай царквы (1773). З жонкаю Варвараю з Глуховічаў меў дзяцей: Івана (*1762, † 1828), які ў 1812 ўзяў шлюб з Агаф'яй Левантовіч, Якуба, Антона й Юзафа, які ў 1811 ажаніўся з Кацярынаю Пятровай.

Самуіл Арцёмавіч валодаў зямлёю ў Папінскай сотні, камяніцаю, садам і гародам паміж Крыжаўзьдзьвіжанскаю царквою й р.Дубровенкаю. Ажаніўшыся з Ганнаю Лапіцкаю, меў сыноў Нічыпара й Купрэя.

Нічыпар у шлюбе з Гафоўскаю меў дзяцей Анісіма (*1778, † 1868), Ганну, Марціна, Праксіду й Яна (*1782), верагодна, апошні быў шляхецкім дэпутатам ад Магілёўскага пав. у 1814, жанаты з Мар'янаю Скарабагатаю. Анісім Нічыпаравіч зь Ядвігаю зь Лісянскіх († 1868) меў дзяцей: Фёдара (*1798), Сьцяпана (*1800, † 1876), Аксенція (*1807), Матрону (*1810), Гаўрылу (*1814) й Мікалая (*1816).

Сьцяпан Анісімавіч - гэнерал-лейтэнант, карабельны інжынер, выкладчык Санкт-Пецярбургскага марскога корпусу (1831-1864). Ён напісаў некалькі манаграфіяў, разам з П.Корсакам выдаваў часапіс «Маяк». Быў жанаты зь Елізаветаю са Зражэўскіх, яго сын Павел (*1837, † 1916) - віцэ-адмірал.

Яўген Сьцяпанавіч (*1836, † 1911) - контр-адмірал, адзін з заснавальнікаў Ўладзівастока (1860).

Прадстаўнік гэтага роду – Мікалай Рыгоравіч (*1871, † 1942) – вучыўся ў Кракаўскай акадэміі мастацтва (1905-1910), потым у Парыжы (1910-1912), прафэсар Харкаўскага мастацкага інстытуту (1925-1931), народны мастак і заслуговы дзеяч мастацтваў Украіны.

Зацьверджаны ў дваранстве Расейскай Імперыі па Магілёўскай губерні (6 частка РК).

## ГУШЧЫ ГЭРБУ «ПУХАЛА»

### ЎЛАДЗІСЛАЎ ВЯРОЎКІН-ШЭЛЮТА

Першыя зьвесткі пра гэтую галіну роду паходзяць з канца XVI ст., калі Кароль Жыгімонт IV надаў (08.07.1588) Яну й Тамашу Г. фальварак ці староства Сьвецян (Ашмянскі пав.) у дажывоцьце, з нагоды таго,

vytoki.net

што іхны маёнтак быў зьнішчаны паспалітым рушэньнем. У гэтым-жа прывілеі згаданы іх бацька Францішак, маршалак войскаў каронных (?).



Ян, маёр в. літ., атрымаў ад Караля Яна-Казімера прывілей (02.07.1649) на стольнікаўства Ашмянскае, добра Востраў і падданых, а таксама канфірмацыю папярэдняга прывілею. Ян, тэстаментам 03.02.1678, пакінуў сыну Якубу маёнт.Востраў; меў яшчэ сыноў Стэфана й Пятра.

Якуб пакінуў сыноў Стэфана, Казімера й дачку, замужам за Пузіноўскім.

Казімер, тэстаментам 16.03.1724, маёнт.Востраў (Полацкае ваяв.) і Пашкевічы (Менскае ваяв.) пакінуў сыну Базылю, з умоваю, каб сваёй сястры Тарэзе, пры заключэньні шлюбу, выплаціў 5000 злотых.

Базыль, застаўшыся без бацькі малагадовым, быў выгнаны з засьц. Востраў полацкімі дамініканамі і, ня маючы грошай і магчымасьці судзіцца, вымушаны быў перайсці на жыхарства ў засьц.Чыгіраўцы ці Бужыншчына, па кантракту ад кн.Агінскага, гэтмана Літоўскага. Ён прадаў у 1731 Юзафу Пузіноўскаму, брату цётачнаму, за 2000 злотых пятую частку фальв.Востраў з 2 падданымі. Меў сыноў Аляксандра, Яна, Гэраніма й Грыгора-Тэадора.

Першыя трое ў 1764 былі ўведзеныя ва ўладаньне Пашковічамі, па сьмерці бацькі. Яны разам з сынамі прадалі ў 1780 Андрэю Сакалоўскаму маёнт.Пашковічы.

У XIX ст. Гушчы жылі ў Ігуменскім, Бабруйскім і Слуцкім пав.

Прызнаныя ў дваранстве Расейскай імперыі вывадамі Магілёўскага зем. суда 1777, Менскага губ. праўленьня 1824 і 1851, Менскага ДДС 16.10.1825, зацьверджаныя ўказамі Сенату 14.06.1860 і 07.12.1883 (6 частка РК).

НГА Беларусі. Ф.319, воп.2, спр.852.

## ЖАЎНЯРКЕВІЧЫ ГЭРБУ «ЯСТРАБЕЦ»

### РЫГОР ЖАЎНЯРКЕВІЧ

Родапачынальнік Міхал Ж. нарадзіўся ў 50-60 г. XVII ст. Яго сын Сьцяпан атрымаў у 1722 прывілей за бацьку, выдадзены кн.Ганнаю з кн.Любартаў-Сангушкаў Радзівіл, на 5 увалокаў зямлі ў засьц.Жаўнераўшчына (Нясьвіская ардынацыя). Сьцяпан набыў у 1733 ў Лаўрэнція Лапы маёнт. Бажышча зь в.Багатка (Ашмянскі пав.). У 1757 (па інш. зьвестках у 1746) Сьцяпан саступіў абодва маёнткі сынам Міхалу, Юзафу, Андрэю, Базылю, Лукашу й Міхалу. Яны прадалі ў 1762 Марціну Макоўскаму маёнт. Бажышча, а іх нашчадкі ў 1789 Яну Чуліцкаму маёнт.Быхаўшчына.

vytoki.net



Сыны Базыля - Юрый, харужы войскаў ВКЛ (1779), другі сын Антоній ў 1794 атрымаў прывілей на возьніцтва або енеральства Менскае.

У XIX - пач.XX ст. большасьць прадстаўнікоў роду жыла ў засьц. Жаўнеркавічы (Менскі пав.) і займалася земляробствам на ўласнай зямлі.

Прызнаныя ў дваранстве Расейскай Імперыі вывадам Менскага ДДС 1816.07.13, зацьверджаныя ўказам Гэрольдыі ад 1856.06.11 (1 частка РК).

НГА Беларусі. Ф.319, воп.2, спр.1092; Ф.319, воп.1, спр.71, арк.661-664адв.; Ф.1816, воп.1, спр.9, арк.16-16адв.; Ф.1727, воп.1, спр.33, арк.432-433адв.

## СІКОРСКІЯ ГЭРБУ «КАПАСІНА»

МАРЫНА КНЫШ



Дакладная гэнеалёгія пачынаецца зь Юрыя Сікорскага, сына Андрэя, які атрымаў у пажыцьцёвае валоданьне маёнт.Пакары (Троцкае ваяв.) (прывілей 1702 Караля Аўгуста I Моцнага). З жонкаю Мар'янаю з Грынкевічаў меў сыноў Ігнація, Сымона, Яна й Мацея. Ён саступіў маёнтак (прывілей 1763 Караля Аўгуста II Саса) сыну Ігнацію, які з Ганнаю з Сабалеўскіх меў сыноў Стэфана, Дамініка (*1795) і Лаўрэнція (*1797).

Ігнацій і Сымон арандавалі ў 1781 у Антонія Замойскага фальв. Ляхаўшчыну. Сымон арандаваў у 1785 у Тадэвуша Ратынскага фальв. Мялінкі.

Петранеля зь Ліцкіх выдала ў 1791 дароўны запіс мужу Сымону на дзедзічны фальв.Ляскоўка (Менскі пав.). Андрэй Ліхадзяеўскі выдаў у 1799 яму-ж адказны ліст на фальв.Княгінічы (Менскі пав.). Сымон – возны Менскага падкаморскага суду (патэнт 1805 ад Тадэвуша Сьвентарэцкага, падкаморага Менскага). Ён меў сыноў Яна (*1786), Антонія (*1791), Францішка (*1796), Зыгмунта (*1798) й Грыгора (*1801).

Антоній з Каэтанаю зь Мелятовічаў меў сыноў Адама (*1819), Яна (*1820), калежскага асэсара Гіпаліта (*1823) і Сабіна (*1829).

Францішак валодаў маёнт.Алесін і Мхерын (Барысаўскі пав.). З жонкаю Вікторыяй з Дакішэвічаў меў сыноў Уладзіслава (*1832), Вітольда (*1837) і Іосіфа (*1837), які быў штатным лекарам Чарнігаўскай семінарыі, лекарам 20-га пешага Галіцкага палка.

Грыгор, сын Сымона, служыў пратакалістам у Менскай рымакаталіцкай кансісторыі, тытулярны радца (1833), жыў у Слуцку.

vytoki.net

Прадстаўнікі роду ў XIX ст. жылі ў Менскім пав. і Вілейскім пав. Віленскай губ.

Прызнаныя ў дваранстве Расейскай Імперыі вывадам Менскага ДДС 1802.12.23, зацьверджаны ўказам Сената 1838.02.28 (6 частка РК).

НГА Беларусі. Ф.319, воп.2, спр.2955; воп.1, спр.32, арк.126-129адв.

## ТУМІЛОВІЧЫ ГЭРБУ «АСТОЯ»

РЫГОР ЖАЎНЯРКЕВІЧ



У гэнеалёгіі родапачынальнікам паказаны Марцін, паручык войскаў польскіх, які быццамбы атрымаў 1432.06.15 прывілей за вайсковыя заслугі ад польскага караля Ўладзіслава III на маёнт.Скародна з 20 валокамі зямлі (Чарнігаўскае ваяв) (?).

Рыгор Станіслававіч (называецца ўнукам Марціна) прадаў вышэйзгаданы маёнтак, а вырučаную суму тэстаментам 1580 пакінуў сынам Яну й Тамашу, ды сынам апошняга - Тадэвушу й Юрыю. Тадэвуш, на пач.XVIII ст. чашнік Смаленскі, валодаў маёнт.Гадалеўшчына (Горадзенскі пав.); па іншых зьвестках яго набыў у 1688 ад Якуба і Ганны Янкоўскіх Базыль, сын Тадэвуша. Сын Базыля Юзаф - віцэ-інстыгатар ВКЛ (1693).

Туміловічы набылі ў 1696 у Стаўбоўскіх зямлю ў засьц.Сьвепарадаўшчына (Наваградзкае ваяв.), а ў 1707 Ян купіў маёнт.Жыжма-Гімбутоўская-Мілінеўская (Лідзкі пав.).

Базыль прадаў у 1732 Кудрыцкім маёнт.Гадалеўшчына, але сын Юзаф адкупіў яго ў 1737; маёнтак быў прададзены ў 1782 Антонію Керсноўскаму. Юзаф-жа набыў для сябе й сыноў Андрэя, Леана, Базыля, Яна й Дзяменція маёнт.Лошыцу зь вёскаю тае-ж назвы (Менскае ваяв.); маёнтак прададзены ў 1779 Плесканэўскаму.

Леан, возны Менскі, атрымаў прывілей на енеральства (1759.05.07 ад Караля Аўгуста II Саса). Харужыя Андрэй і Дзяменцій атрымалі рангі паручыкаў (1777). Сын Базыля - Казімер, ротмістар (1778).

Юзаф і ўсе нашчадкі па мячу атрымалі ў 1761 за службу ў апалчэньні ад кн.Мікалая-Казімера Радзівіла, гэтмана ВКЛ, ленны маёнт. Гальбаўшчыну. Кн.Дамінік Радзівіл перасяліў у 1808 Туміловічаў у засьц.Сьвіранава (ля Новага Сьвержаня) на 12 валокаў зямлі, дзе на працягу XIX і пач.XX ст. жыла большасьць прадстаўнікоў роду.

Прызнаныя ў дваранстве Расейскай Імперыі вывадам Менскага ДДС 1802.11.27, зацьверджаныя указам Сената ад 1859.12.17 (1 частка РК).

НГА Беларусі. Ф.319, воп.2, спр.3293, 3295.

vytoki.net

## ПРА АЎТАРАЎ

*Яўген Анішчанка* – кандыдат гістарычных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АНБ.

*Ўладзіслаў Вяроўкін-Шэлюта* – Суддзя Выводны ЗБШ.

*Станіслаў У. Думін* – кандыдат гістарычных навук, навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Старшыня адроджанага «Историко-Родословного Общества в Москве».

*Рыгор Жаўняркевіч* – саіскальнік у асьпірантуры Белдзяржуніверсітэта, галоўны архівіст Нацыянальнага Гістарычнага архіва Беларусі.

*Марына Кныш* – старэйшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага Гістарычнага архіва Беларусі.

*Андрэй А. Міхайлаў* – кандыдат гістарычных навук, асістэнт катэдры Айчыннай гісторыі Пскоўскага педінстытута.

*Сяргей Рыбчонак* – саіскальнік у асьпірантуры Белдзяржуніверсітэта, галоўны архівіст Нацыянальнага Гістарычнага архіва Беларусі.

*Ірына Шпілеўская* – вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага Гістарычнага архіва Беларусі.

*Андрэй А. Шумкоў* – Ґэнеалёг Санкт-Пецярбургскага Шляхецкага сходу, адказны рэдактар «Дворянского календаря: Справочной родословной книги российского дворянства», сябра Рады Русскага Гэнеалягічнага таварыства і Рэдакцыйнай рады «Известий РГО».

*Зьміцер Яцкевіч* – саіскальнік у асьпірантуры Белдзяржуніверсітэта, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага Гістарычнага архіва Беларусі.

 vytoki.net

## SUMMARY

### The Nobility lists

*J.Aniščanka*. The "vakolica" of nobility in East-Belarusian governments. 1783-1785 and 1798-1799. ........ 3

On the material of population revisions of 1783-1785 and 1798-1799 in Mahilioŭ and Polacak gouvernments, the author has made an analysis of the economic state of not rich noble families. In the article are put on the lists of inhabitants for each "vakolica"(a little settlement, inhabited mostly by the poor noble families) of noble origin and their peasants, and amount of land they posessed. There is also a general name index.

*S.V.Dumin*. The Tatar lancier regiment of the russian army. Lists of 1814-1816. ........ 31

The name list of the officers, belarusian nobles of tatar nationality, with short service records and biographical notes.

### The research on separate regions

*A.A.Michailov, A.A.Shumkov*. Belarusian-lithuanian and Polish nobility in the family register of the Pskov government of the Russian Empire. ........ 47

Includes information about the families which resided in the Pskov government, and got (or tried to have) their noble status of the Russian Empire confirmed.

### Families' history

*S.Rybčonak*. The Dvarecki-Bahdanovičs: materials for their genealogy. ........ 57

Although a complete family history is still ahead, some of the branches of that numerous family are published.

### The small family register

*I.Špilieŭskaja*. The Akinčycs, arms «Akšak». ........ 71
*Ž.Jackievič*. The Buračoks, arms «Nalienč». ........ 71
*Ŭ.Viaroŭkin-Šeliuta*. The Huščas, arms «Puchala». ........ 72
*R.Žaŭniarkievič*. The Žaŭniarkievičs, arms «Jastrabiec». ........ 73
*M.Knyš*. The Sikorskis, arms «Kapasina». ........ 74
*R.Žaŭniarkievič*. The Tumilovičs, arms «Astoja». ........ 75

Brief articles on various noble families.

**About authors** ........ 76

## УМОЎНЫЯ ПАЗНАЧЭНЬНІ Й СКАРОТЫ

* – нараджэньне
  * /1830 – перад 1830
  * 1830/ – пасьля 1830
  * 1810/30 – паміж 1810 і 1830

~ – хрост
x – шлюб
)( – скасаваньне шлюбу
† – сьмерць
» (пасьля імя) – не пакінуў нашчадкаў
ГАПО – Государственный архив Псковской области
НГА Беларусі – Нацыянальны Гістарычны архіў Беларусі (Менск)
РГАДА – Российский государственный архив древних актов (Москва)
РГВИА – Российский государственный военно-исторический архив (Москва)
РГИА – Российский государственный исторический архив (Санкт-Петербург)

---

## ПАПРАЎКА

У папярэднім нумары часапіса ў артыкуле С.Рыбчонка «Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагодзьдзя (Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі)» у сьпісах сяброў ложаў зроблены памылкі:

надрукавана (павінна быць)

Сябры варштату «Паўночная паходня».

15. Багіжмольскі (Бачыжмальскі)
28. Фурка (О'Рурка)
33. Ліфтон-Арыст Вандзевіч (Люфтон- Арыст Вайдзевіч)
38. Верчун (Вергун)
39. Ветлер (Бэтхэр)
49. Датамінскі (Дабашынскі)
50. Гэнрыцкі (Генрыцы)
55. Дзітоўскі (Дыбоўскі)
61. Замойскі (Зяманскі)
70. Каратокцін (Карабіцін)
129. Ужыхоўскі (Выпыхоўскі)

прапушчаны Юзаф Сьвянціцкі

Ганаровыя сябры варштату "Паўночная паходня".

1. Агінскі (Асінскі)
5. Ахлі (Ахме)
8. Відза (Відзга)
41. Навамітскі (Навамейскі)
54. Сержыінскі (Сярпінскі)

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

Да артыкула Ў.Вяроўкина-Шэлюты «Васіль Цяпінскі й род Слушкаў-Цяпінскіх у 16 стагоддзі» [ № 1(2), 1994].

1. Настасься Слушка дачка не Івана, а Грыгора Слушкі. Яна жонка кн. Андрэя Андрэевіча Лукомскага, памёрла 18.12.1581. Мела сястру Юльяну, якая памёрла раней 1554 г.
2. У Івана Слушкі была дачка Зоф'я, якая была замужам за кн. Багданам Андрэевічам Лукомскім, памёрла пасьля 1605 г. (Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. W-wa, 1895. S. 216, 218-219).
3. Эльжбэта Слушка (дачка Івана?) была замужам за Адамам Храбтовічам, памёрла ў 1593 г. (Boniecki A. Herbarz Polski. W-wa, 1900. T.III. S.91).

vytoki.net

## У БЛІЖЭЙШЫХ НУМАРОХ

Дзяржава

*Е.В.Пчелов.* Древнейший Полоцк и полоцкие князья по письменным источникам.

Тэрытар`яльныя досьледы

*В.В.Латыпова.* Белорусские шляхтичи в истории Уфимско-Оренбургского края.

*Валерый Пазднякоў.* Клецкая шляхта XVI-XVII стагоддзяў.

Гісторыя родаў

*Людміла Хмяльніцкая.* Адляніцкія-Пачобуты гэрбу «Здарбожац» (Віцебская галіна).

*Ўладзіслаў Вяроўкін-Шэлюта.* Сьлізьні гэрбу ўласнага.

Някропаль

*Віталь Ханецкі.* Пахаваньні на могілках у Астрашыцкім Гарадку, Раўбічах, Аколіцы, Губічах (да 1917 года).

## ЧАСАПІС МОЖНА НАБЫЦЬ

Менск

Кіёск гістарычнай літаратуры.

Гістарычны факультэт БДУ (вул. Чырвонаармейская, 6).

Віцебск

У пана Аляксандра Буевіча.

Тэл. 4-58-07.

Москва

У г-на Станислава Владимировича Думина.

На семинарах Историко-Родословного Общества: актовый зал нового корпуса Исторической библиотеки (Старосадский переулок, д. 9). Проезд до ст. метро "Китай-город". Третья среда каждого месяца, с 18 до 20 часов.

Санкт-Петербург

У г-на Андрея Александровича Шумкова.

1. На семинарах Русского Генеалогического Общества: конференц-зал РНБ (вход с ул. Садовой, д. 18).
Второй четверг каждого месяца с 18.30.
Последняя суббота каждого месяца с 16 до 18 часов.
2. В Санкт-Петербургском Дворянском Собрании.

---

Вопросы распространения журнала в России возложены редакцией на г-на А.А.Шумкова. Его адрес: 197198, Санкт-Петербург, а.я. 291.

vytoki.net